# Гісторыя

*Д.С. БУЦІН*

## КОПНЫ СУД НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Рассматривается состояние украинской, российской и белорусской историографии копного суда на белорусских землях ВКЛ. Отмечается недостаточная разработанность данного вопроса, в частности его историографического обзора. Делается вывод о концептуальной ошибке всех предыдущих исследователей – идентификации копы как суда конкретной крестьянской общины, а не как местного всесословного межобщинного суда населения определенной территории.

The article considers the state of the Ukrainian, Russian and Belarusian historiography of Kopa court on the Belarusian territory of the Grand Duchy of Lithuania. It also notes that the issue isn't elaborated enough in particular from the point of its historiographical review. The author also points out a significant conceptual mistake of the previous researchers and historic schools – the identification of 'kapa' as the court of a concrete peasant community, but not as the local inter-communal court of a certain territory.

На сённяшні момант амаль што няма грунтоўных даследаванняў па пытанні дзейнасці копных судоў на беларускіх землях Вялікага Княства Літоўскага (далей – ВКЛ). Аднак расійская і ўкраінская гістарычная навука XIX – першай трэці XX ст. прынесла шэраг прац, якія сталі больш-менш карыснымі нарысамі ў галіне мясцовай звычаёвай прававой традыцыі ў выглядзе капы. Здзейснім гістарыяграфічны агляд тых гістарычных школ і навукоўцаў, якія зрабілі найбольшы ўклад у сферу распрацоўкі гэтай праблематыкі.

Упершыню ўласна гэтым пытаннем пачаў цікавіцца прафесар Кіеўскага універсітэта імя Святога Уладзіміра М.Д. Іванішаў[1]. У сваім невялікім даследаванні ў 34 старонкі (якое, між іншым, не зусім дакладна акрэслівае азначаную праблему), створаным на падставе 22 актаў паўднёва-заходняй Русі, што адносіліся да XV–XVII ст., гісторык першым паказаў існаванне грамадска-вечавых судоў на ўкраінскай тэрыторыі. Праца складаецца з манаграфічнай часткі і дадаткаў у выглядзе шасці копных рэляцый (пратаколы, якія складаў возны, ці віж). Дзеля гэтага ён прапрацаваў каля трохсот актавых кніг Луцкага, Уладзімірскага і Жытомірскага гродскіх судоў. Хаця дадзены рэгіён не з'яўляецца аб'ектам нашага даследавання, але па аналогіі з функцыянаваннем гэтых мясцовых украінскіх коп можна правесці паралелі з беларускім копным судом, і трэба адзначыць, што падабенстваў намнога больш, чым адрозненняў. М.Д. Іванішаў дакладна і абгрунтавана трактуе шматлікія састаўныя часткі копнага суда: паходжанне слова капа; месца збору капы – «капавішча»; шырокае кола ўдзельнікаў суда; правілы склікання капы і наступствы нез'яўлення на ёй; галоўныя аспекты копнага следства, судаводства і прысудаў. Таксама ён слушна ідэнтыфікаваў «сёла аколічныя» (суседнія) з вёскамі, якія ўваходзяць у адну «копную аколіцу» (раён). Навуковец падкрэсліваў значную ролю капы ў грамадскім жыцці простага сялянскага люду. Але не абышлося і без недарэчнасцей, таму што з прычыны абмежаванасці патрэбных крыніц і поўнай адсутнасці хоць нейкіх напрацовак па тэме ўсё будавалася з нуля. Самымі спрэчнымі з'яўляюцца наступныя палажэнні: абшчынная прырода копнага суда; пытанне, якое тычыцца копных аколіц; сцвярджэнне, што ў сходах маглі ўдзельнічаць толькі гаспадары; выключна сялянскае паходжанне копных суддзяў; колькасць магчымых коп па адной справе і прамежак часу паміж імі; знікненне капы ў XVII ст. у працэсе набыцця яе функцый панскім судом; галоўная крыніца копнага судаводства пісанае, а не звычаёвае права. Аўтар не бачыў розніцы паміж сялянскай грамадой і капой. Аднак усё гэта ніякім чынам не змяншае ўклад М.Д. Іванішава на шляху раскрыцця дадзенай тэмы, ён з'явіўся сапраўдным піянерам у гэтай справе. Працу даследчыка яшчэ ў XIX ст. прааналізаваў С.О. Шалковіч, які зрабіў некаторыя асабістыя заўвагі і каментарыі[2].

Найбольш значным па згаданай тэме не толькі ва ўкраінскай гістарыяграфіі, а і ўвогуле з'яўляецца даследаванне І. Чаркаскага[3]. Тут аўтар удала падсумаваў усю вядомую інфармацыю па гісторыі судовай установы і выклаў новыя асабістыя меркаванні. Абсалютная большасць выкарыстаных у даследаванні крыніц паходзіць з зямель Беларусі, што ў нашым выпадку з'яўляецца вельмі карысным. Манаграфія складаецца з уступу і шасці частак. Уступ уяўляе сабой падрабязны і якасны агляд крыніц, і асабліва гістарыягра-

фіі праблемы, што было зроблена ўпершыню, калі не ўлічваць невялічкі крытычны артыкул І. Джыджоры на працу А.Я. Яфіменка яшчэ ў пачатку XX ст.[4] Першая частка кнігі – гэта ўводная інфармацыя пра «грамадскі» (так І. Чаркаскіназываў капу) суд: назва; паходжанне; будова і судаводства; геаграфічныя межы распаўсюджання; час існавання і прычыны знікнення; узаемаадносіны з гродскім і панскім судамі. У другой частцы разглядаецца праблема судовай канструкцыі капы: склад удзельнікаў; іх сацыяльны стан; абавязак станавіцца на капу; колькаснасць – абранне суддзяў і інстытут прадстаўніцтва; «старана» (сведкі); працэдура склікання капы; месца правядзення; кампетэнцыя па справах і ў адносінах да асоб; копныя аколіцы; адкладанне справы. Трэцяя частка прысвечана прававому працэсу на капе: непасрэдная падрыхтоўка да суда; скарга пакрыўджанага; апытванне на капе; агляданне; інстытут «ганення следу» («гарачая капа»); «трус» (вобыск); «ліцэ» (уліка); «інстытут зводу» (своеасаблівая вочная стаўка); сведчанні; «заклад» (доказы сваёй невінаватасці); розныя прафесійныя даручэнні капы і копнікаў; прысяга; абвінавачанне. Наступная, чацвёртая, падрабязна апісвае копнае абвінавачанне злачынцы: арышт абвінавачанага; «зарука» (няўстойка); допыт абвінавачанага; яго выдача на капу; «проба» (катаванні); «воланне» (абгаворванне). Пятая частка знаёміць чытача з рашэннямі капы і іх выкананнем: судовыя рашэнні; падставы для іх; накладанне віны і пакаранне за яе; традыцыя і практыка «навязкі» (своеасаблівы штраф); апраўданне на капе; адсыланне копнай справы на разгляд вышэйшаму суду; адказы «капы» (давядзенне свайго рашэння да зацікаўленых у справе бакоў); апеляцыя; яднанне (замірэнне судовых бакоў); непасрэднае выкананне копнага прысуду; судовыя выплаты і выдаткі копных бакоў (пошліны). Шостая, і апошняя, частка прысвечана асобым спецыяльным відам капы – капа аб спашы (патрава) і капа аб мяжы.

Мэтай гэтай працы было вызначэнне будовы і судовага працэсу капы, што ў асноўным даволі добра атрымалася. Галоўны вынік даследавання – капа была сапраўдным (але спецыфічным) судом і вельмі моцным, бо не толькі вяла следства, разглядала справы і выносіла выракі, а адразу і выконвала іх. І. Чаркаскі адносіў пачаткі суда да XI–XIII, канчатковае афармленне – да XV, а росквіт – да XVI–XVII ст., падмацоўваючы гэта дадзенымі крыніц. Прычыну ўзнікнення копнага сходу даследчык бачыў не ў кругавой паруцы, а ў рэальнай выгадзе, якую давала сельскаму насельніцтву дадзеная ўстанова. Аўтар даказаў, што прынцыповай розніцы паміж капой на ўкраінскай і беларускай тэрыторыях няма, але ў рэальнасці на нашых землях яе дзейнасць была актыўнай і лічылася больш легітымнай. Насупераk мінулым даследчыкам распрацаваў уласную тэорыю з'яўлення і асноўных характарыстык копных аколіц – гэта не дакладна фіксаваныя тэрытарыяльныя адзінкі, а мабільныя акругі сялянскай грамады. Ён вельмі скрупулёзна падышоў да вывучэння шматлікіх інстытутаў копнага судаводства. Адмоўнымі бакамі працы можна лічыць наступнае: навуковец выкарыстоўвае тэрмін «грамадскі», а не копны суд, што з'яўляецца штучным, бо ён амаль не сустракаецца ў судовых крыніцах; у яго даследаванні нельга прасачыць пэўную эвалюцыю капы ў прасторы і часе; заняпад суда аўтар звязвае выключна з палітычнымі наступствамі падзелаў Рэчы Паспалітай, адмаўляючы сацыяльна-эканамічны аспект гэтай з'явы, што значна спрашчае праблему. Манаграфія крыху перагружана дакументальнымі ўстаўкамі, якія робяць яе падобнай да зборніка дакументаў з невялічкімі каментарыямі да іх. І. Чаркаскі ў большасці з момантаў проста канстатуе пэўны факт, не прааналізаваўшы ўсю карціну цалкам. Даволі дзіўна выглядае і аўтарская інтэрпрэтацыя геаграфіі: Берасцейская, Ваўкавыская і Слонімская землі ў яго вачах чамусьці з'яўляюцца адназначна ўкраінскімі тэрыторыямі. Але, безумоўна, гэтая праца – вялікі ўклад у сферу вывучэння беларускага копнага права і ставарае перад будучымі даследчыкамі пэўныя арыенціры. Таксама ў адным са сваіх артыкулаў І. Чаркаскі разгледзеў такі цікавы звычай вуснага права, як «паваланне» (крык) над трупам забітага[5]. Аўтар вядомы і як даволі крытычны, але справядлівы рэцэнзент прац Р. Лашчанкі і Н.Ю. Мірзы-Авак'янц, што тычыліся вывучаемай намі тэмы[6].

На некалькі гадоў раней пабачыла свет праца прафесара Р. Лашчанкі, але яна носіць у асноўным кампілятыўны характар і з'яўляецца сімбіёзам распрацовак ранейшых даследчыкаў без належнага аўтарскага падыходу[7]. Слушным момантам з'яўляецца сцвярджэнне аб панаванні прыватнага права ў копным судаводстве. Асноўны мінус згаданага даследавання ў тым, што навуковец вельмі мала карыстаўся першакрыніцамі пры стварэнні сваёй манаграфіі. Як і ранейшыя даследчыкі, ён бачыць у копнай аколіцы тэрытарыяльную адзінку з пастаяннымі межамі, што, як даказваюць дакументы, не адпавядае рэчаіснасці. У некаторых момантах патрыятызм гісторыка мяжуе з этнацэнтрызмам і ўкраінскім шавінізмам. Структура дадзенай працы таксама пакідае жадаць лепшага. Р. Лашчанка з'яўляецца аўтарам рэцэнзіі на раздзел аб копных судах у вялікай працы гісторыка і правазнаўцы А. Якаўлева, прысвечанай гісторыі судаводства ва Украіне. А. Якаўлеў зрабіў значны ўклад у распрацоўку праблемы ўкраінскага звычаёвага права і дзейнасці копнага суда. Грунтоўна даследаваў народныя «копныя» прымаўкі ў кантэксце іх адлюстравання ў вусным праве, вызначыў склад і кампетэнцыю капы, дыскутуючы з ранейшымі даследчыкамі, распрацаваў тэорыю ўзнікнення і функ-

цыянавання копных аколіц, апісаў копны працэс і прывёў асноўныя прычыны знікнення дадзенай з’явы[8]. У артыкуле А. і В. Заікіных, якія праілюстравалі стан украінскай гісторыка-прававой навукі ў эміграцыі (у асноўным у Чэхаславакіі) і яе ідэалагічных напрамкаў, у гістарыяграфічных і крытычных аспектах аналізаваліся працы Р. Лашчанкі і А. Якаўлева[9].

Сярод прадстаўнікоў расійскай гістарыяграфіі асобай, што стала вядучай у нялёгкай працы даследавання тэмы, якая дагэтуль увогуле амаль што не была вядома не толькі шырокаму колу грамадства, але і навуковаму асяродку, з’яўляецца архіварыус Віцебскага архіва старажытных грамат І.Я. Спрогіс, які пасля працаваў у Віленскім цэнтральным архіве старажытных актаў[10]. Ён адным з першых паставіў пытанне аб вытоках суда і паходжанні, значэнні самога слова капа, а таксама ўсёй асноўнай тэрміналогіі копнага сходу; месцы, дзе адбывалася пасяджэнне копнага суда; хто збіраўся на капу; якія справы разглядалі копнікі; хто з афіцыйных асоб прысутнічаў на судовых пасяджэннях; аб асноўных формах і відах капы; аб структуры судаводства; аб функцыях і кампетэнцыі; аб метадах і спосабах пакарання; аб заняпадзе такой з’явы ва ўласнабеларускай юрыдычна-прававой практыцы, як традыцыя копных сходаў. Працуючы з актавымі кнігамі гродскіх судоў заходняй часткі этнаграфічнай Беларусі (менавіта тут знаходзіліся матэрыялы копнага судовага працэсу), І.Я. Спрогіс разгледзеў усе асноўныя моманты, якія апісваліся ў так званых рэляцыях («цэдулах»). Навуковец змог паказаць не толькі непасрэдную прававую дзейнасць копнікаў, але і пастараўся выкласці асноўныя тэорыі ўзнікнення, эвалюцыі, а таксама вынікі дзейнасці копнага суда для будучыні беларускага права ўжо ў сваім пісьмовым варыянце. Ён першым выказаў думку, што шляхціцы таксама маглі быць копнымі суддзямі. Галоўная вартасць працы даследчыка заключаецца ў даволі грунтоўным падыходзе да разгляду, мабыць, самага складанага пытання, а менавіта пачаткаў копнага суда. Станаўленне капы ён выводзіў з эвалюцыі вечавога ладу і традыцыі Рускай Праўды часоў Яраслава Мудрага з прычыны таго, што ў тэксце Праўды Яраслава і ў копным судаводстве назіраецца шматлікае тэрміналагічнае падабенства. Калі з першым складальнікам, у выглядзе веча, можна пагадзіцца, то гіпотэза аб вырашальным уплыве заканадаўства Рускай Праўды на зараджэнне капы выглядае не зусім пераканаўча. Некаторыя аднолькавыя тэрміны мелі зусім рознае значэнне ў старажытнарускім і копным справаводстве. Такі пункт гледжання дастаткова спрэчны і адразу выклікае пытанне: чаму тады практыка копных судоў назіраецца амаль выключна на тэрыторыі Беларусі і толькі ў некаторых раёнах Украіны, у той час калі дзейнасць Рускай Праўды мела распаўсюджанне на больш шырэйшай тэрыторыі. Зразумела, гэты факт можна растлумачыць тым, што на тагачасных беларуска-ўкраінскіх землях не існавала той моцнай цэнтральнай улады, як на ўласнарускай тэрыторыі, што дало магчымасць гэтаму рэгіёну захаваць сапраўды народную юрыдычную ўладу, аднак вельмі непераканаўча выглядае дадзенае тлумачэнне. Калі звярнуць увагу на слабыя месцы ў працах І.Я. Спрогіса, то можна адзначыць адсутнасць некаторых прынцыповых момантаў у карціне дзейнасці капы, засяроджванне ўвагі на дробязях, своеасаблівую юрыдычную наіўнасць. Даволі спрэчнай з’яўляецца пазіцыя даследчыка, калі ён сцвярджае, што ў большасці сваёй копныміісцамі былі паны. Аўтар стаў пачынальнікам навуковай крытыкі дадзенага пытання: праводзіў палеміку з А.Я. Яфіменка, аналізаваў працу М.Д. Іванішава. Безумоўна, самай значнай заслугай І.Я. Спрогіса з’яўляецца факт падрыхтоўкі, складання прамовы і выдання XVIII тома Актаў Віленскай археаграфічнай камісіі «Аб копных судах». Даследчык даў штуршок і стаў сапраўдным папулярызатарам вывучэння гэтай тэмы ў адносінах да ўсіх аматараў даўніны, якія працавалі пасля яго.

Амаль у гэты ж час даследаваннем функцыянавання капы займалася і адзіная жанчына даследчыца звычаёвага права Расіі, Украіны і Беларусі А.Я. Яфіменка[11]. Копныя суды аўтар называла «народнымі». Яна не толькі працягнула даследаванні І.Я. Спрогіса, але і па некаторых пытаннях намнога больш паглыбілася ў праблему, напрыклад, у пытанні аб прысязе, якой адведзена вельмі значная частка. Гісторык прыводзіць цікавыя звесткі аб існаванні ў ВКЛ прысягі на пярсцёнку. Арыгінальнай з’яўляецца яе тэорыя аб дадзяржаўнай прыродзе і часе паходжання ўстановы, нагадваючы, што kuopa перакладаецца з літоўскай мовы як родавая грамада. А.Я. Яфіменка сцвярджала, што «пастаўленне шапкі і галёнкі» – гэта своеасаблівы судовы заклад. Яна адзначыла і вельмі спецыфічныя адмоўныя рысы копнага судаводства – копнікі часта накладалі віну не на сапраўднага злачынцу, а на асобу, якую ў канкрэтных абставінах па нейкіх прычынах можна было абвясціць злодзеем; зусім не кожная справа, што разглядалася капой, даводзілася да свайго лагічнага заканчэння. Аўтар прывяла інфармацыю аб існаванні грашовых укладаў удзельнікаў капы ў агульную касу, хутчэй за ўсё гэта былі своеасаблівыя штрафы. Даследчыца засяроджвала сваю ўвагу на спаборнасці бакоў падчас вялікай капы, якую яна называе «вольным праўным мавеннем». Найбольш значнай памылкай А.Я. Яфіменка з’яўляецца меркаванне, што «гарачая капа» была выключна следчым, а зусім не судовым органам, таму не мела права выносіць і выконваць прысуд. На самай справе ўсе віды копнага суда – «гарачая», «вялікая», «завітая» копы – былі самастойнымі, незалежнымі і аўтаномнымі часткамі, якія маглі існа-

ваць адзін без аднаго ў тым ці іншым выпадку. Выклікае сумненне пазіцыя А.Я. Яфіменка аб тым, што копны след гнаўся толькі да трох межаў. Даследчыца надае прысязе першае месца сярод копных доказаў, але ж у сапраўднасці па сваёй значнасці спачатку ішла рэчавая ўліка, паказанні сведак і толькі потым прысяга. Аўтар сцвярджае, што найбольш звычайным заканчэннем завітой капы было павешанне злачынцы, аднак сапраўды гэта вельмі рэдкае і надзвычайнае пакаранне. Гісторык атаясамлівае паміж сабой такія зусім розныя тэрытарыяльныя адзінкі, як воласць і копная аколіца. А.Я. Яфіменка пашырала тэрыторыю існавання копных судоў на ўсю Левабярэжную Украіну, хаця, як сведчыць вядомы фактычны матэрыял, капа фіксуецца толькі на Старадубшчыне. Аўтар адмаўляла факт існавання такога копнага інстытута, як прадстаўніцтва. Даследчыца даволі песімістычна ўяўляла сабе дзейнасць копных сходаў на працягу ўсяго XVII ст., што не вельмі стасуецца з дадзенымі крыніц. Галоўная прычына заняпаду судовай дзейнасці, лічыць навуковец, – польскі ўплыў. Увогуле, некаторыя яе разважанні маюць не навуковы, а аматарскі характар і з'яўляюцца даволі прыблізнымі. Дадатным момантам з'яўляецца тое, што А.Я. Яфіменка паклала пачатак навуковай палеміцы, якая дала магчымасць больш эфектыўна і глыбока асвятліць згаданую праблему.

Да сённяшняга моманту адзіным даследчыкам пытання «чужых людзей» (не мясцовых жыхароў) на капе з'яўляецца Р.В. Дземчанка[12]. Аўтар праводзіць паралелі паміж імі і інстытутам «судных мужоў» у Расіі. Яны маглі выступаць на судзе ў якасці назіральнікаў, сведкаў і нават суддзяў. Чужых аўтар называе «прытомнымі», бо ў копных рэляцыях яны пісалі – «пры том быў…». Гэтая катэгорыя ўдзельнікаў капы замяняла сучасныя пратакольныя запісы судовых пасяджэнняў. Ён падрабязна апісвае сацыяльна-маёмасны, колькасны, якасны склад «прытомнага боку», асоб, якія маглі прывесці іх на капу, магчымыя варыянты «прытомных» у час канкрэтнага сходу, функцыі, правы і абавязкі гэтых людзей. Падчас даследчык перабольшвае месца «прытомнага боку» ў копнай дзейнасці. У адзначанай працы ўсебакова выкладзена роля гэтага спецыфічнага, хаця і малавядомага інстытута копнага судаводства. Навуковец бачыць першую згадку аб капе ў традыцыі ганення следу часоў Рускай Праўды. Таксама аўтар даследаваў інстытут судовых мужоў у маштабах усяго ўсходнеславянскага рэгіёна, дзе закрануў і дзейнасць копнікаў.

Адной з найлепшых прац па гісторыі копных сходаў на Беларусі, якая таленавіта сінтэзавала ранейшыя даследаванні і прынесла шэраг уласных палажэнняў, з'яўляецца артыкул вядомага беларускага палітычнага дзеяча, гісторыка і юрыста М.В. Шкялёнка[13]. Тут усебакова разгледжана канструкцыя (будова) і практыка капы. Тэорыя вучонага аб паходжанні капы амаль асобна ад уплыву Рускай Праўды ў выніку трансфармацыі і эвалюцыі мясцовай вечавой традыцыі з'яўляецца найбольш верагоднай і слушнай. Калі ў працэсе ўмацавання велікакняжацкай улады веча страціла сваю былую палітычную вагу, у вечавой кампетэнцыі засталіся толькі пытанні бягучых гаспадарчых спраў і мясцовыя юрыдычна-прававыя аспекты жыцця насельніцтва. Менавіта ў гэты час і нараджаецца з'ява копнага сходу. Гісторык адзначаў, што капа мае тую асаблівасць, якая не сустракаецца ні ў якім іншым судзе ВКЛ: тут разглядаліся не толькі ўласнасудовыя справы, як ва ўсіх астатніх судовых установах, але і паўсядзённыя праблемы і пытанні сялянскай грамады. Дадатнай рысай працы з'яўляецца і тое, што М.В. Шкялёнак не толькі яскрава паказаў усю дзейнасць капы ад свайго зараджэння да канчатковага заняпаду, але і праз унікальнасць гэтага суда як уласнабеларускай з'явы ў прававой культуры народа правёў думку аб самадастатковасці беларускай дзяржавы на ўсім яе гістарычным шляху. Калі прыгадаць час, у які быў напісаны артыкул (на пачатку 1933 г.), адразу ж стане бачным, якую каштоўнасць набываюць гэтыя мужныя незалежніцкія словы навукоўца-патрыёта.

Трэба заўважыць паўсюдную і выключна значную памылку амаль усіх згаданых навукоўцаў і гістарычных школ – ідэнтыфікацыя капы як грамадскага суда канкрэтнай сялянскай абшчыны. На самай справе яна з'яўлялася ўсесаслоўным мясцовым міжабшчынным судом пэўнай тэрыторыі або копнай аколіцы, пад уладу якой маглі не падпадаць толькі вышэйшыя станы грамадства (ды і то выключна па сваім жаданні): прадстаўнікі дзяржаўнай улады, магнатэрыя, шляхта, духавенства і мяшчане, гарады якіх мелі права на самакіраванне. Таму на капе маглі прысутнічаць і прымаць удзел прадстаўнікі розных грамад ці ўвогуле не абшчыннікі, а людзі іншых, не сялянскіх, груп насельніцтва і саслоўяў.

Такім чынам, трэба адзначыць, што ўсе прааналізаваныя працы зроблены на аснове састарэлай метадалогіі. На сённяшні момант неабходны даследаванні, створаныя пры дапамозе навейшых навуковых метадаў. Толькі гэта дасць магчымасць убачыць выключную значнасць інстытута копнага суда для ўсяго тагачаснага грамадства цалкам і кожнага чалавека асабіста.

[1] Гл.: Иванишев Н.Д. О древних сельских общинах в Югозападной России. Киев, 1863.

[2] Гл.: Шолкович С.О. О копных судах // Сб. статей, разъясняющих польское дело по отношению к Западной России. Вильна, 1887. Вып. 2. С. 109–131.

[3] Гл.: Черкаськiй I. Громадськiй (копнiй) суд на Украïнi – Русi XVI–XVIII вв. // Працi комiсiї для виучування iсторiї захiдно-руського та вкраïнського права. Киïв, 1928. Вип. 4–5.

[4] Гл.: Джиджори I. З новiйшоï украïнськоï iсторiографiï (А. Ефименко. Южная Русь: очерки, исследования и заметки. Т. I–II) // Записки наукового товариства iменi Шевченка. Наукова часопись присьвячена передовсiм украïнськiй iсторiï, фiльольоґiï й етнографiï. Львiв, 1906. Т. LXXI. Кн. III. С. 134–157.

[5] Гл.: Черкаськiй І. Поволання над трупом забитого // Праці комісіі для виучування історіі західно-руського та вкраінського права. Київ, 1925. Вип. 1. С. 90–107.

[6] Гл.: Черкаськiй І. [Рэцэнзія] // Праці комісіі для виучування історіі західньо-руського та українського права. Київ, 1926. Вип. 2. С. 290–294. Рэц. на: Лащенко Р. Копні суди на Украіні, іх походження, компетенція і устрій // Збірнік правничоі комісіі при історично-фільософічній секціі наукового товариства імени Шевченка. Львів, 1925. Вип. 1. С. 1–67; Ён жа. [Рэцэнзія] // Там жа. Київ, 1929. Вип. 6. С. 509–514. Рэц. на: Лащенко Р. Копні суди на Україні, іх походження, компетенція і устрій (кінец). Львів, 1926. Вип. 2. С. 141–189; Ён жа. [Рэцэнзія] // Там жа. Київ, 1927. Вип. 3. С. 455–456. Рэц. на: Лащенко Р. Український копний процес (по карній справе) на одному прикладі // Записки Українськоі господарчоі академіі в ЧСР. Подебради, 1927. Ч. 1. С 175–187; Ён жа. [Рэцэнзія] // Там жа. Київ, 1927. Вип. 3. С. 456–460. Рэц. на: Мірза-Авак'янц Н.Ю. Нариси з історіі суду в Лівобережній Украіни у другій половині XVII століття. І. Роля громади в судовій практиці // Науковы збірник Харьківськоі навуково-дослідноі кафедри. Харків, 1926. Т. II.

[7] Гл.: Лащенко Р. Копні суди на Украіні, іх походження, компетенція і устрій // Збірнік правничоі комісіі при історично-фільософічній секціі наукового товариства імени Шевченка. Львів, 1925. Вип. 1. С. 1–67.

[8] Гл.: Яковлів А. Українські народні приказки й звичаеве право // Життя і право. Львів, 1928. № 7. С. 12–29; Ён жа. Копні суди на Україні // Ювілейний збірник на пошану Президента Масарика. Прага, 1930. С. 50–64.

[9] Гл.: Заікини А. і В. Історично-правнича наука украінськоі еміграціі, та головні ідеольогічні напрямки в ній // Przewodnik Historyczno-Prawny. Czasopismo kwartalne. R. V (1934, 1935, 1936). Lwow, 1937. S. 52–70.

[10] Гл.: Спрогис И.Я. Древние народные копные суды в северо-западной окраине России // Тр. IX археологического съезда в Вильно в 1893 г. Вильна, 1893. С. 242–260; Ён жа. Древний народный копный суд в Северо-Западной Руси. Витебск, 1895; Ён жа. Древний русский документ-декрет граничного копного суда 1531 год. 15 ноября. Витебск, 1898; Ён жа. Народный суд литвинов над колдунами (чародеями) 1615 года. Вильна, 1896; Ён жа. По поводу статьи «Народный суд в Западной Руси» // Журн. М-ва народного просвещения. 1895. № 2. С. 181–199; Ён жа. Предисловие // АВАК. Т. XVIII. Акты о копных судах. Вильна, 1891. С. 19–61.

[11] Гл.: Ефименко А.Я. Народный суд в Западной Руси: (Исторический очерк) // Русская мысль. 1893. Кн. 8. Отд. 2. С. 1–29; Кн. 9. Отд. 3. С. 21–40; Яна ж. О копных судах // Труды IX археологического съезда. Т. 2. Протоколы. М., 1897. С. 56–59; Яна ж. Копные суды в Левобережной Украине // Киевская старина. 1885. № 10. С. 189–203; Яна ж. Южная Русь. Очерки, исследования и заметки. СПб., 1905. Т. I. С. 310–369.

[12] Гл.: Демченко Г.В. Притомные люди и копная сторона // Варшавские университетские известия. 1899. № 5. С. 1–42.

[13] Гл.: Шкялёнак М.В. Беларусь і суседзі: Гістарычныя нарысы. Беласток, 2003. С. 196–217.

Паступіў у рэдакцыю 01.11.09.

***Дзяніс Сяргеевіч Буцін*** – магістрант кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў. Навуковы кіраўнік – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў Ю.Л. Казакоў.